1. Гегелова, Н. С. Культурная миссия российского телевидения // Вестн. Рос. ун-та дружбы народов. Сер. Литературоведение, журналистика. – 2010. – № 2. – С. 96–103.

2. Мясникова, М. А. Морфологический анализ современного российского телевидения / М. А. Мясникова // Автореферат дисс. доктора филологических наук. - Екатеринбург, 2010. – 46 с.

3. Ревенко А. А. Тематическая направленность и целевое назначение программ о путешествиях и туризме на отечественном телевидении // Таврический научный обозреватель. / А. А. Ревенко. – Режим доступа: https://cyberleninka.ru/article/n/tematicheskaya-napravlennost-i-tselevoe naznachenie-programm-o-puteshestviyah-i-turizme-na-otechestvennom-televidenii. – Дата доступа: 10.02.2025.

Кірыленка А.Д., студэнт 350 групы
дзённай формы атрымання адукацыі
Навуковы кіраўнік – Герасімёнак Д.В.,
кандыдат культуралогіі

## ТУРЫСТЫЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ РАТУШ БЕЛАРУСІ

Ратушы ўзнікаюць на тэрыторыі Беларусі ў XVI ст. з распаўсюджваннем Магдэбургскага права. З нямецкай мовы Rathaus азначае “дом сходаў”, паколькі ў ратушы размяшчаўся магістрат – саслоўны орган гарадскога самакіравання. Будынак звычайна размяшчаўся ў цэнтры горада, непасрэдна на плошчы. Там жа знаходзіўся і рынак, а таксама крамы і гандлёвыя рады.

Характэрнай рысай беларускіх ратуш з’яўляецца просты двухпавярховы будынак, які мае вежу са шпілем, якую ўпрыгожвалі гадзіннік і звон, якія

сімвалізуюць самастойнасць горада. Тым не менш, сустракаліся будынкі і без вежаў (напрыклад, у Слоніме можна ўбачыць былы будынак ратушы, які яе не мае). Звычайна ў гэтых ратушах размяшчаліся судовыя архівы, гарадская казна ці канцылярыя. Для беларускіх ратуш характэрны архітэктурныя стылі барока і класіцызм, аднак ратуша ў Чачэрску характэрна тым, што сумяшчае ў сабе некалькі стыляў, у тым ліку элементы готыкі [3, с. 43].

Калісьці на беларускіх землях было больш за 25 ратуш, якія служылі важнымі цэнтрамі жыцця гарадоў. Аднак з-за доўгага часу іх існавання, войн і іншых прычын па сённяшні час захавалася толькі сем такіх будынкаў. Гэта ратушы, размешчаныя ў Віцебску, Мінску, Нясвіжы, Магілёве, Шклове, Слоніме і Чачэрску. Кожнае з гэтых збудаванняў мае сваю ўнікальную гісторыю і архітэктурныя асаблівасці, якія адлюстроўваюць культурныя традыцыі свайго часу. Тым не менш, на сённяшні дзень ратушы з’яўляюцца не толькі культурна-дасугавымі цэнтрамі гарадской прасторы, несучы ў сабе гісторыю і эстэтычную каштоўнасць, але не выконваючы функцыі будынка, прызначанага для гарадскога магістрата [4, с. 1–2].

Віцебская ратуша была пабудавана ў 1597 г. і з таго часу некалькі разоў рэстаўравалася. Першапачаткова драўляны будынак быў пабудаваны мясцовымі жыхарамі самастойна, але яго разабралі, бо Віцебск страціў права на самакіраванне. Пазней, калі горад ізноў атрымаў Магдэбургскае права, быў створаны новы будынак, ужо двухпавярховы. У 1775 г. ён быў цалкам перабудаваны.

Зыходзячы з вынікаў расскопак, калісьці ў Віцебскай ратушы знаходзіліся печы з размаляванай “галандскай” пліткай, што можа сведчыць аб тым, што магістрат не шкадаваў сваіх грошай дзеля ўпрыгожвання інтэр’ераў. У 1974 г. праводзілася рэстаўрацыя будынка, пры якой былі разабраны дабудоўкі, з-за якіх ратуша адрознівалася ад свайго варыянта пабудовы ў XVIII ст. У 1997 г. на галоўным фасадзе быў устаноўлены двухмятровы бронзавы герб горада.

Зараз у будынку ратушы знаходзіцца краязнаўчы музей. З цікавых фактаў варта адзначыць, што ад мясцовых жыхароў можна часам пачуць слова “каланча” ў адносінах да вежы. Прычынай гэтаму з’яўляецца тое, што некалі ў вежы знаходзіўся пажарны пост для назірання за горадам [5, с. 10].

Будаўніцтва Мінскай ратушы адносіцца да 1591 г. На той час будынак знаходзіўся пасярод Высокага рынку (дзе ў дадзены момант размяшчаецца пл. Свабоды) і лічыўся адной з самых знакамітых пабудоў на плошчы. У канцы XVIII ст. ратуша была перабудавана, атрымаўшы элементы класіцызму і набыўшы класічны выгляд сярод беларускіх ратуш. За перыяд з XVIII і да XIX ст. у будынку знаходзіліся магістрат, гарадскі суд і нават музычная школа, але ў 60-я гг. XIX ст. пабудова была цалкам разбурана.

Тым не менш, у XX ст. ўзнікае ідэя пабудаваць ратушу нанова. Аднаўлялася яна ў адпаведнасці з чарцяжамі, якія захаваліся. На вежу ўстанавілі герб Мінска, флюгер і гадзіннік. Зараз унутры будынка размяшчаецца музейная экспазіцыя, цэнтральнае месца ў якой займае сімвалічны “Ключ горада Мінска”, а таксама зала для сустрэч гарвыканкама [5, с. 11–12].

У канцы XVI ст. была пабудавана найстаражытная на сённяшні час сярод будынкаў гарадскога самакіравання Нясвіжская ратуша. У 1752 г. будынак набыў архітэктурны стыль позняга барока. У выніку падаўжэння гандлёвых радоў за ратушу, утварыўся П-вобразны дворык. У перыяд з канца XVI да пачатку XIX ст. у будынку паспелі пабываць магістрат, архіў, скарбніца і шмат іншага, аднак з-за вялікага пажару 1836 г ратуша была фактычна перабудавана да сваёй апошняй рэстаўрацыі ў 1997-2004 гг. Сёння ў ей знаходзіцца гарадскі музей, а сам будынак наведвае не менш за 50 тысяч чалавек за год [2, с. 351–352].

У другой палове XVII ст. была пабудавана Магілёўская ратуша. На той час гэта быў двухпавярховы будынак з вежай, які знаходзіўся на Рынкавай плошчы (цяпер гэта пл. Славы). Ратуша шмат разоў перабудоўвалася за перыяд сваёй

гісторыі. У 1773 г. ратуша была відазменена і зроблена падобнай на будынкі губернатара і віцэ-губернатара, пабудаваныя ў стылі класіцызму. У пасляваенны час знаходзілася фактычна ў занядбаным стане. Тым не менш, усё яшчэ існавалі ініцыятары, якія жадалі аднавіць ратушу. Будынак зноў быў узведзены толькі ў 2007 г. і адкрыты праз год.

Сёння Магілёўская ратуша выглядае як варыянт сярэдзіны XVIII ст. У будынку знаходзіцца музей, а таксама гадзіннікавы механізм і гарніст, які прыцягвае да сябе турыстаў не толькі з усёй Беларусі, але і з-за мяжы. Цяпер Магіслаў (так жыхарамі Магілёва названы гарніст) кожны дзень выконвае гарадскую фанфару з балкона ратушы апоўдні. Варта сказаць, што ў рамках экскурсіі можна самастойна запусціць механізм, а таксама паглядзець на горад з бінокляў, якія знаходзяцца на балконе будынка [5, с. 12–13].

Шклоўская ратуша была збудавана ў XVIII ст., пасля атрымання горадам Магдэбургскага права ў 1672 г. У выніку пажару ратуша была адрэстаўравана, і цяпер выглядае як прамавугольны двухпавярховы будынак з двухузроўневай дзевяцікутнай вежай і купалам з фігурным шпілем. Падобна Магілёўскай, Шклоўская ратушы мае балкон на вежы. Паколькі на момант рэстаўрацыі мясцовым жыхарам была неабходная гандлёвая плошча – да ратушы былі прыбудаваны аднапавярховыя рады з гандлёвымі памяшканнямі, ствараючы тым самым замкнёную кампазіцыю, якая закрывая ўнутраны двор.

Уся забудова ратушы была адрэстаўравана ў 1999 г. Цяпер на шпілі вежы можна ўбачыць герб горада, у той час як на сценах знаходзяцца гадзіннікі. Зараз у гістарычным будынку размяшчаюцца гімназія і гісторыка-краязнаўчы музей. Трэба адзначыць, што Шклоўская ратуша ўнесена ў амерыканскі каталог помнікаў сусветнай архітэктуры [1, с. 84–85].

У другой палове XVIII ст. ў цэнтры Слоніма была пабудавана Слонімская ратуша, якая ўяўляе сабой прамавугольны ў плане двухпавярховы будынак пад

двухсхільным дахам, дзе размяшчаўся не толькі магістрат, але таксама знаходзіліся памяшканні суда, гаўптвахты і архіва.

З цягам часу былая ратуша стала падобнай да суседніх будынкаў, аднак запісы з архіваў далі зразумець, што Слонімская ратуша знаходзіцца на вул. Савецкай, 6. Гэта значыць, будынак гарадской бібліятэкі. І толькі пілястры, якія ўпрыгожваюць фасад, нагадваюць аб тым, што гэты будынак калісьці быў сімвалам гарадскога самакіравання. Тым не менш, ратуша уключана ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь [6, с. 108–109].

У другой палове XVIII ст. Кацярына II падарыла Чачэрск графу З. Г. Чарнышову. Прыкладна тады ж і была пабудавана Чачэрская ратуша. Калісьці вакол гэтага будынка знаходзіліся цэлых чатыры храмы, аднак, з цягам часу, захавалася толькі Праабражэнская царква.

Чачэрская ратуша вылучаецца на фоне астатніх сваёй незвычайнай пабудовай і спалучэннем архітэктурных стыляў. У той час як для беларускіх ратуш з’яўляецца характэрным будынкі, пабудаваныя ў стылі класіцызму ці барока, ратуша Чачэрска мае рысы псеўдаготыкі. Верагодна, змешванне розных стыляў адбылося па жаданні генерала Чарнышова.

Ратуша выглядае як двухпавярховы прамавугольны будынак, які мае ажно пяць драўляных вежаў. На чатырох вежах устаноўлены шпілі. Больш высокая – пятая вежа, якая знаходзіцца пасярэдзіне і не мае шпіля, характэрная зубчастым завяршэннем. Цікавы факт: у залежнасці ад таго, пад якім вуглом глядзець на пабудову, у ёй праглядаюцца класічныя, гатычныя і нават усходнія матывы. Акрамя таго на паўночны захад і паўночны ўсход ад ратушы раскрываюцца выдатныя віды на пойму рэк Сож і Чачора, а таксама на Замкавую гару і стары парк.

Будынак ратушы, помнік архітэктуры рэспубліканскага значэння, рэстаўраваўся ў 2003 г. і зараз у ім знаходзіцца этнаграфічны музей, у якім кожны год праходзіць акцыя “Ноч музеяў” [7, с. 266].

Такім чынам, ратушы Беларусі маюць значны турыстычны патэнцыял, які можна і трэба развіваць. З прадстаўленай вышэй інфармацыі трэба звярнуць увагу на тое, што беларускія ратушы – даволі разнастайныя і ў кожнай з іх ёсць, з чым азнаёміцца, а музеі ў гэтых будынках садзейнічаюць большай зацікаўленасці турыстаў. Тым не менш, ратушы могуць уваходзіць і ў турыстычныя маршруты як адна з магчымых кропак, дапамагаючы наведвальнікам даведвацца пра гісторыю і культуру горада ў шырокім кантэксце. Важна інтэграваць азначаныя будынкі ў аглядныя турыстычныя маршруты па краіне, што дасць магчымасць павысіць цікавасць беларускага грамадства і гасцей краіны да айчыннай гісторыі і культуры, а таксама садзейнічаць устойліваму развіццю турыстычнай галіны Рэспублікі Беларусь.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Демура, Д. Т. Влияние социальных процессов на формирование архитектурного решения белорусских ратуш / Д. Т. Демура // Инновационные технологии и образование : междунар. научн.-практ. конф., Минск, 29-30 апреля 2021 г. : в 2 ч. / Белор. нац. техн. ун-т ; редкол.: А. М. Маляревич (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БНТУ, 2021. – Ч. 2. – С. 83–87.

2. Жук, В. Г. Стилистические особенности архитектуры Несвижа / В. Г. Жук // Молодость. Интеллект. Инициатива : материалы XI Междунар. научн.-практ. конф. студентов и магистрантов, Витебск, 21 апреля 2023 г. : в 2 т. – Витебск : ВГУ имени П. М. Машерова, 2023. – Т. 2. – С. 350–352.

3. Ловейко, А. В. Ратуши Беларуси / А. В. Ловейко // Электронный сборник трудов молодых специалистов Полоцкого государственного университета / Полоцкий гос. ун-т ; редкол.: Д. Н. Лазовский (пред.) [и др.]. – Новополоцк : ПГУ, 2018. – Вып. 24 (94). – С. 43–45.

4. Роскач, Е. А. Ратуша как культурно-досуговый центр городского пространства / Е. А. Роскач // Национальная культура глазами молодых : сб. материалов XXXIX итоговой научн. конф. студентов, магистрантов, аспирантов, Минск, 26-27 марта 2014 г. / Белор. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУКИ, 2014. – С. 579–581.

5. Трусаў, А. А. Музеефікацыя беларускіх ратуш / А. А. Трусаў // 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею : матэрыялы навук. канф., Віцебск, 30-31 кастрычніка 2008 г. / Віцеб. абл. краязн. музей. – Мінск, 2009. – С. 9–14.

6. Тур, Э. А. Городская библиотека г. Слонима – историко-культурное наследие Гродненской области / Э. А. Тур, Е. В. Счасная // Реставрация историко-культурных объектов как сохранение наследия Республики Беларусь : сб. статей научн.-технич. семинара, Брест, 26 сентября 2023 г. / Брестск. гос. техн. ун-т ; редкол.: Э. А. Тур [и др.]. – Брест : БрГТУ, 2023. – С. 108–115.

7. Чантурыя, У. А. Чачэрская ратуша / У. А. Чантурыя // Беларуская энцыклапедыя : У 18 т. ; рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2003. – Т. 17: Хвінявічы – Шчытні. – С. 266.

Кишкурно Ж.Л., студент 301 группы,
очной формы получения образования
Научный руководитель – Стельмах А.М.,
кандидат искусствоведения, доцент

## КУРАТОРЫ И АРТ-МЕНЕДЖЕРЫ КАК АРХИТЕКТОРЫ ВЫСТАВОЧНОГО ПРОСТРАНСТВА

Выставки выступают важным механизмом привлечения посетителей независимо от своей тематики. Вместе с тем существует ряд теоретических и